■ Сацыяльная абарона

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ? ВАМ АДКАЖА ЮРЫСТ!

Як даведацца нумар сваёй чаргі на сацыяльнае жыллё і ад чаго залежыць хуткасць яе руху? Ці можа наймальнік звольніць маці, якая гадуе дзіця-інваліда? На гэтыя пытанні адказвае юрыст Офіса па правах людзей з інваліднасцю Вольга ТРЫПУЦЕНЬ.

Стаю на чарзе на сацыяльнае жыллё...

Я маю дзіця-інваліда і знаходжуся на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Скажыце, як даведацца нумар сваёй чаргі на сацыяльнае жыллё і ад чаго залежыць хуткасць яе прасоўвання? *(С.В., г. Мінск)*

Базы даных аб грамадзянах, якія знаходзяцца на такім уліку, фарміруюць мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя дзяржаўныя органы і арганізацыі, якія ажыццяўляюць улік грамадзян, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Звесткі аб чарговасці на аснове гэтага ўліку выдаюцца па просьбе грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Для таго каб даведацца нумар чаргі на кватэру, вам лепш за ўсё звярнуцца ў выканкам з пісьмовай просьбай. Каб ваш зварот стаў афіцыйным, зарэгіструйце яго ў выканкаме або адпраўце па пошце з паведамленнем аб уручэнні. Згодна з Законам «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб», адказ вам павінны даслаць на працягу месяца.

У мінчан ёсць магчымасць даведацца інфармацыю аб сваёй чарзе на сайце Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта па наступнай спасылцы http://minsk.gov.by/ru/och/.

Па пытанні аб'ёмаў будаўніцтва ў вашым раёне рэкамендуем таксама звярнуцца ў свой выканкам (адміністрацыю).

У мяне дзіця-інвалід. Ці могуць мяне звольніць?..

Ці можа наймальнік звольніць мяне, калі майму дзіцяці-інваліду яшчэ не споўнілася пяць гадоў? *(Ірына К., г. Мінск)*

Згодна з арт. 28 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 1999 года № 296-З, скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка з цяжарнымі жанчынамі, жанчынамі, якія маюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў, адзінокімі маці, якія маюць дзяцей ва ўзросце ад трох да чатырнаццаці гадоў (дзяцей- інвалідаў — да васямнаццаці гадоў), не дапускаецца, акрамя выпадкаў ліквідацыі арганізацыі, спынення дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка, а таксама ў сувязі з:

— Прагулам (у тым ліку адсутнасцю на працы больш за тры гадзіны на працягу працоўнага дня) без прычын;

— Сістэматычным невыкананнем работнікам без уважлівых прычын абавязкаў, ускладзеных на яго працоўным дагаворам ці правіламі ўнутранага працоўнага распарадку, калі да работніка раней прымяняліся меры дысцыплінарнага спагнання;

— З'яўленнем на працы ў стане алкагольнага, наркатычнага ці таксічнага ап'янення, а таксама распіццём спіртных напояў, ужываннем наркатычных сродкаў або таксічных рэчываў у працоўны час або па месцы працы;

— Здзяйсненнем па месцы працы крадзяжу маёмасці наймальніка, устаноўленага прысудам суда, які ўступіў у законную сілу, або пастановай органа, у кампетэнцыю якога ўваходзіць накладанне адміністрацыйнага спагнання;

— Аднаразовым грубым парушэннем правілаў аховы працы, якое пацягнула калецтва або смерць іншых работнікаў;

— Аднаразовым грубым парушэннем працоўных абавязкаў (гэта тычыцца пасад кіраўнікоў арганізацыі або адасобленага падраздзялення і яго намеснікаў, галоўных бухгалтараў і яго намеснікаў);

— Зменай уласніка маёмасці арганізацыі (у дачыненні да кіраўніка арганізацыі, яго намеснікаў і галоўнага бухгалтара);

— Парушэннем (без уважлівых прычын парадку і тэрмінаў выплаты заробатнай платы і (або) дапамог (гэта тычыцца кіраўніка арганізацыі);

— Здзяйсненнем вінаватых дзеянняў работнікам, які непасрэдна абслугоўвае грашовыя і матэрыяльныя каштоўнасці, калі гэтыя дзеянні з'яўляюцца падставай для страты даверу да яго з боку наймальніка;

— Здзяйсненнем работнікам, які выконвае выхаваўчыя функцыі, амаральнага ўчынку, несумяшчальнага з працягам гэтай працы.

Пры гэтым у адпаведнасці з п. 22 Пастановы Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 29 сакавіка 2001 г. № 2 «Аб некаторых пытаннях прымянення судамі заканадаўства аб працы» адзінокай маці лічыцца жанчына, якая нарадзіла дзіця па-за шлюбам, у выпадку, калі звесткі пра бацьку дзіцяці ў актавым запісе аб нараджэнні зроблены ва ўстаноўленым парадку па ўказанні маці.

Такім чынам, вы не можаце быць звольнены па ініцыятыве наймальніка (акрамя вышэй пералічаных выпадкаў):

— Да дасягнення дзіцем 3 гадоў — у любым выпадку;

— Калі ў вас ёсць дзіця ва ўзросце ад 3 да 14 гадоў (дзяцей-інвалідаў — да 18 гадоў) — у выпадку, калі вы з'яўляецеся адзінокай маці.

Святлана БУСЬКО.

P.S. ***Калі ў вас узніклі нейкія дадатковыя пытанні, вы можаце звяртацца з імі да юрыстаў Офіса па правах людзей з інваліднасцю па тэл. +375 (17) 256-08-29, або па E-mail: info@disright.org***

Кансультацыі бясплатныя.

■

■ У паветры

У БЕЛАРУСЬ ЗМОГУЦЬ ПРЫЙСЦІ ЛОЎКОСТАВЫЯ* КАМПАНІІ

Хутка беларускі парламент будзе ўносіць змены ў чарговы дакумент — Паветраны кодэкс РБ. У сярэдзіне ліпеня дырэктар дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый Уладзімір КОСЦІН паведаміў, што гэты акт пасля перапрацоўкі зменіцца ажно на 80%. Былі анансаваны і канкрэтныя змены.

Адной з галоўных і самых значных папраўкак у Паветраным кодэксе называюць дазвол на выкарыстанне так званых «невяртальных» квіткоў. Увядзенне падобнай сістэмы можа даволі значна паўплываць на кошт палётаў — кажуць нават пра лічбу ў -30%. Ці могуць тарыфы насамрэч так зніізіцца і ці такая ўжо страшная рэч гэтыя «невяртальныя» квіткі? На пытанні адказвае **Ігар ЧАРГІНЕЦ, намеснік гендырэктара кампаніі «Белавія» па маркетынгу і знешнеэканамічнай дзейнасці:**

— Я пачаў бы з таго, што слова «невяртальныя» квіткі вельмі негатыўна ўздзейнічае на кліентаў. Яны пужаюцца, думаюць, што атрымаць свае грошы назад ні ў якім выпадку не змогуць. Але гэта не так. Мы прадаём квіткі нават за год да рэйса. Верагоднасць, што ў чалавека адбудзецца нешта непрадбачанае за гэтыя час, вядома, расце. Калі кліент проста фізічна не можа паляцець (напрыклад, хварэе, ці здараецца нешта падобнае), кампанія без праблем вяртае грошы. Гэтае права пасажыра абараняецца заканадаўствам. «Невяртальны» — гэта квіток, які нельга перанесці на іншы дзень ці час. Бываюць выпадкі, калі людзі за мяжой вучацца, працуюць і дакладную дату вяртання не ведаюць. Ім трэба карыстацца звычайнымі квіткамі, каб у экстраннай сітуацыі змяніць дату пералёту за невялікую даплату. Зусім іншая справа — людзі, якія ведаюць, куды і на які тэрмін яны ляцяць. Ім няма чаго баяцца.

— Як звязаны «невяртальныя» квіткі з лоўкоставымі кампаніямі? Ці варта чакаць рэзкага падзення цаны на ўсе тарыфы пасля прыняцця новага кодэкса?

— Звычайна адна з умоў існавання чыстых лоўкоставых кампаній — гэта магчымасць прадаваць «невяртальныя» квіткі. Вы ж разумееце, такія перавозчыкі працуюць, што называецца, «на тоненькага». Абавязковая ўмова акупнасці — забітыя «пад завязку» самалёты. Магчыма, са з'яўленнем «невяртальных» квіткоў у Беларусь прыйдуць і паўнавартасныя лоўкосты. «Белавія» ж лоўкостам не з'яўляецца, як не з'яўляецца і класічнай авіякампаніяй. Мы паступова пераходзім на гібрыдны тып, які аб'ядноўвае ў сабе рысы як тых, так і другіх. На цэнах гэта адбіваецца пазітыўна: тыя, хто за імі сочыць, могуць пацвердзіць, што нашы квіткі за апошні час патаннелі прыкладна ў 2 разы. Але гэта не значыць, што са з'яўленнем «невяртальных» квіткоў нашы рэйсы раптам стануць каштаваць 30 еўра, як гэта бывае ў паўнавартасных лоўкостаў. Нават усе магчымыя змены мы праводзім паступова, і рэзкіх скачкоў цэн у той ці іншы бок не бывае.

— Ці бачылі вы гатовы праект новага кодэкса?

— Пакуль што не, таму лічу бессэнсоўным каментаваць яго агулам. Магчыма, падчас прыняцця будуць унесены сур'ёзныя праўкі. Але вельмі добра, што пры распрацоўцы звярнуліся да нас і прынялі да ўвагі некаторыя нашы пажаданні. Канчаткова нешта ацэньваць можна будзе толькі пасля зацвярджэння акта.

— Гэтай вясной вы анансавалі распрацоўку новага брэнда кампаніі. Як ідзе праца ў гэтым кірунку? Я заўважыў, што старая шыльда знікла з будынка галоўнага офіса.

— Так, шыльда знікла, але проста таму, што яна старая, а новую яшчэ не павесілі (*смяецца*). Што датычыцца брэнда, то зараз праца трохі затармазілася. Былі праведзены сустрэчы з усімі прэтэндэнтамі — да гэтай працы мы вернемся восенню. Зараз жа сезон, можа банальна не хапаць часу. Якраз сёння мы нарэшце вырашылі яшчэ адну праблему: чэшскія авіяліініі раптам змянілі расклад сваіх рэйсаў у Мінск у сярэдзіне лета. Звычайна так не робіцца, бо з-за разыходжання ў некаторыя дні рэйсаў з беларускай сталіцы ў Прагу і назад не было. Мы ліквідавалі гэты прабел сваімі сіламі, павялічыўшы колькасць уласных рэйсаў. Якраз сёння атрымалі на гэта дазвол ад чэхаў. Таму летам можа быць не да брэнда.

— Ці не ўваходзіць у праект брэндзінгу больш актыўнае выкарыстанне беларускай мовы?

— У нас і зараз ёсць паведамленні па-беларуску. Аднойчы мы паспрабавалі перакласці ўсё на родную мову — атрымалі скаргі ад пасажыраў. Пасля зрабілі наадварот, усё па-руску, — такі самы вынік, людзі скардзяцца. Таму мы ўвесь час у пошуку кампрамісу.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.

**лоўкосты (ад англ. low-cost — танны) — або бюджэтныя авіякампаніі — кампаніі, якія прапаноўваюць кліентам вельмі нізкія цэны за пералёты ў абмен на адмову ад традыцыйнага авіясэрвісу.*

Ёсць мільённы пасажыр у 2013-м!

Колькасць пасажыраў, перавезеных Нацыянальнай авіякампаніяй «Белавія» ў гэтым годзе, дасягнула аднаго мільёна чалавек, перадае БЕЛТА. Намеснік генеральнага дырэктара па маркетынгу і знешнеэканамічнай дзейнасці РУП «Нацыянальная авіякампанія «Белавія» Ігар Чаргінец уручыў мільённаму пасажыру сертыфікат на два авіябілеты на рэгулярныя рэйсы па любым напрамку маршрутнай сеткі авіякампаніі. Шчаслівічыкам стала маладая беларуска, пасажырка рэйса Мінск — Лондан, якая накіроўваецца на вучобу. Таксама ў якасці бонуса замест эканомкласа дзяўчына паляцела бізнес-класам.

■ Памяць

БЕЛЫ ПТАХ, ЯКІ АДЛЯЦЕЎ...

Спасаўка — шчодры час года... Шчодры мёдам і садавіной, шчодры цеплынёй сонца... Вось-вось пазалацее лістота... Прыгожая пара. Некалі амаль у гэтую пару для Пушкіна пачыналася Болдзінская восень... А для многіх з нас, беларускіх журналістаў, час сумны, бо вось днямі сабраліся на жалобную сустрэчу на Паўночных могілках: сёння год, як няма сярод нас на гэтым свеце нашага сябра, для многіх іншых калег — настаўніка і кіраўніка, Уладзіміра Бельскага — Валодзі. Былога шматгадовага галоўнага рэдактара сёння звяздоўскай «Чырвонкі», старшыні Дзяржкамдруку, аднаго з першых надзвычайных і паўнамоцных паслоў нашай краіны ў Чэхіі і Славакіі, пазней — галоўнага рэдактара газеты «Сям'я» і банкаўскага аналітыка, палітолага, пісьменніка і паэта, сябра і светлага-светлага чалавека... Колькі там яшчэ нават да той пенсіі было — нейкай нібыта мяжы — а чалавека год як няма з намі...

У нас, журфакаўцаў БДУ імя Леніна выпуску 1981-га, ён быў старастам курса. Пасля войска і падрыхтоўчага аддзялення каму, як не яму, было наканавана вазіць нас па «бульбах» і будатрадах, арганізоўваць у інтэрнатах на Кастрычніцкай дыскатэкі са святламузыкай, пластмасавыя пласцінкі для ліхтароў якой мы разам з ім шукалі па навакольных сметніках... Не фізікі-хімікі, а менавіта журналісты першымі зрабілі такі цуд для нашых інтэрнатаўскіх суботніх вечарын...

Рэдактарства «Чырвонкай» прыпала для яго на няпросты канец 90-х і доўжылася да 1996-га. Газета была вялікатыражная, цікавая, а на «чырвонкаўскім» паверсе Дома друку можна было папросту пагаварыць з Міколам Федзюковічам і Валерыем Івановым, Анатолем Ярмоленкам і з музыкантамі толькі што народжаных тады многіх беларускіх гуртоў, са славутымі літаратарамі...

Народны артыст Беларусі, кампазітар Валерый Іваноў:

— Самыя светлыя ўспаміны пра гэтага чалавека і самая адчайная туга па ім... Вельмі мала людзей, якія маглі стольк часу аддаваць сябрам... Мне Валодзя прысвяціў паэму — вось узяў і напісаў... Былі мы адзін у аднаго і ў кватэрах, і ў бацькоўскіх дамах... А ён жа са знакамітых калінкавіцкіх Юравічаў... І я пачуваўся там як дома, бо з ім было цёпла. Я не люблю такіх слоў — «заўчасна пайшоў», «мог бы яшчэ жыць»... Жыві ты 50 або 100 гадоў... Але калі адыходзіць Асоба — гэта страшэнна сумна і ў жыцці вельмі не хапае нечага вялікага і істотнага. Я дакладна ведаю: пры такіх людзях, як ён, для многіх з нас жыццё робіцца куды лепшым...

...А спяваць Валодзя, будучы студэнтам, любіў вясковыя прыпеўкі, і, напэўна, найлепшую беларускую песню пра завушніцы....

Пятро РАМАНЧУК

■

«БЕЛАРУСЫ» — СВАЕ І НА ВЕНГЕРСКІХ НІВАХ

Мінскі трактарны завод і надалей адным з прыярытэтных кірункаў будзе лічыць пашырэнне продажаў сваёй тэхнікі ў Еўропе. Пра гэта было заяўлена на нарадзе кіраўніцтва «МТЗ», якая прайшла ў Венгрыі з удзелам беларускіх дыпламатаў на базе кампаніі «Беларус Трактар».

Кампанія «Беларус Трактар» — гэта 100-працэнтная ўласнасць МТЗ, які даўно і паспяхова ажыццяўляе продаж нашых трактароў розных мадыфікацый на венгерскім рынку, прычым мае ў горадзе Хорт, што паблізу Будапешта, уласны выставачна-складскі цэнтр. Цяпер менавіта «Беларусы» з'яўляюцца адной з вядучых пазіцый беларускага экспарту ў Венгрыю. Летась у гэтай краіне прададзена 900 адзінак тэхнікі на суму 16 млн долараў, сёлета — ужо 690 (на суму каля 13,5 млн).

Кіраўніцтвам МТЗ якраз і вывучаўся станоўчы вопыт дзейнасці кампаніі «Беларус Трактар» на венгерскім рынку. Менавіта з улікам гэтага вопыту абмеркаваны стратэгія павышэння эфектыўнасці і пашырэння продажаў беларускіх трактароў у Еўропе, пытанні забеспячэння сэрвіснага абслугоўвання тэхнікі, паляпшэння яе якасці ў адпаведнасці з еўрапейскімі стандартамі, а таксама далейшае ўдасканаленне дылерскай сеткі ў рэгіёне.

Між тым, па звестках Белстата, у першым паўгоддзі ў нас выраблена 34,4 тыс. трактароў для сельскай і лясной гаспадаркі, што складае 90,4% да ўзроўню мінулага года. Экспарт трактароў склаў у студзені—маі 20066 адзінак тэхнікі на 377 млн долараў.

Такім чынам, калі часам гаворыцца пра значныя складскія запасы, прыклад венгерскага прадстаўніцтва МТЗ сведчыць пра тое, што наша тэхніка па-ранейшаму запатрабавана. Гандляваць вучыцца нікому і ніколі не позна...

Пятро РАМАНЧУК.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

У ШКОЛЬНЫМ РАСКЛАДЗЕ БУДУЦЬ ТРЫ ГАДЗІНЫ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

У новым навучальным годзе ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі на занятку фізічнай культурай і спортам будзе адводзіцца 3 гадзіны ў тыдзень. Такім чынам у галоўным адукацыйным ведамстве збіраюцца кампенсаваць дэфіцыт рухальнай актыўнасці, характэрны для абсалютнай большасці школьнікаў.

Два вучэбныя ўрокі будуць праводзіцца ў адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам. Трэцяя «Гадзіна здароўя і спорту» таксама становіцца абавязковай і ўносіцца ў расклад вучэбных заняткаў.

— Да правядзення «Гадзіны здароўя і спорту» будуць прад'яўляцца такія ж арганізацыйныя, педагагічныя і санітарна-гігіенічныя патрабаванні, як і да правядзення ўрокаў фізічнай культуры, — патлумачылі журналісту «Звязды» ў галоўным адукацыйным ведамстве. — «Гадзіна здароўя і спорту» з'яўляецца працягам урокаў фізічнай культуры і шчыльна звязана з імі агульнымі задачамі, сродкамі навучання і метадамі арганізацыі заняткаў. Падчас «Гадзіны здароўя і спорту» навучэнцы атэстуюцца на агульных падставах.

Надзея НІКАЛАЕВА.

У БЫХАВЕ ЎШАНУЮЦЬ ПАМЯЦЬ БАРЫСА СТРАЛЬЦОВА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На будынку Быхаўскага раённага цэнтра культуры, абноўленага да Дня беларускага пісьменства, з'явіцца мемарыяльная дошка, прысвечаная ўраджэнцу Быхаўшчыны, заслужанаму дзеячу культуры Рэспублікі Беларусь Барысу Васільевічу Стральцову.

Імя гэтага вядомага беларускага журналіста, выкладчыка і пісьменніка таксама будзе прысвоена Быхаўскай раённай цэнтральнай бібліятэцы.

— Гэта слушная ініцыятыва абласнога аддзялення Беларускага саюза журналістаў, — патлумачыў першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Андрэй Кунцэвіч. — Больш за тое, ніводнай бюджэтнай капейкі на мемарыяльную дошку не выдаткавана: сродкі на яе сабралі самі журналісты рэгіёна.

Урачыстае адкрыццё дошкі памяці Барыса Стральцова ў Быхаве запланавана на 31 жніўня, калі пачнуцца мерапрыемствы да XX юбілейнага Дня беларускага пісьменства.

Ілона ІВАНОВА.

ЗНОЎ КАНТРАБАНДНЫЯ ШТЫК-НАЖЫ

Адзін баранавіцкі калекцыянер не так даўно затрымліваўся брэсцкай мытняй як парушальнік правілаў правозу. Два месяцы таму ён перавозіў праз мяжу 12 штык-нажоў і адну шаблю. Тавар тады канфіскавалі.

На гэтым тыдні ён зноў вёз з Польшчы штык-нажы да розных мадыфікацый аўтамата Калашнікава і керамічны посуд перыяду Другой сусветнай вайны. А ў мытнай дэкларацыі ўказаў, што вязе ўмывальнік коштам 75 долараў. Але спецыялісты зазірнулі ў нішу для запаснога кола. Там знаходзілася сумка, у якой былі ўпакаваны 13 штык-нажоў, а таксама прадметы посуду.

Яна СВЕТАВА.

РАССЛЕДАВАННЕ БУДЗЕ ПРАДОЎЖАНА

Расследаванне справы ў дачыненні да былога дырэктара Белдзяржцырка прадоўжана. Аб гэтым паведамілі ў аддзеле інфармацыі і сувязі з грамадскасцю Следчага камітэта Беларусі.

«Следчы камітэт працягвае расследаванне па гэтай крымінальнай справе. Тэрмін расследавання прадоўжаны да кастрычніка», — адзначылі ў СК.

Нагадаем, што крымінальную справу ў дачыненні да Таццяны Бандарчук распачала Генеральная пракуратура Беларусі па матэрыялах Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі МУС і КДК. Аб тым, што былы дырэктар Белдзяржцырка падазраецца ў злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі (ч.3 арт.424 КК), стала вядома яшчэ ў пачатку чэрвеня. Але ўжо ў канцы таго месяца на прэс-канферэнцыі намеснік генпракурора Аляксей Стук адзначыў, што ў поле зроку следства патрапілі новыя эпізоды дзейнасці падазраванай. Сярод іх бясплатная рэалізацыя квіткоў на прадстаўленні для асобных людзей, незаконнае страхаванне замежных гастралёраў, выплата прэміяльных артыстам, якія знаходзіліся на прадстаўленні за мяжой.

Надзея ПАЎЛАВА.

СЭНС ДЭМАКРАТЫІ: УРОКІ «АРАБСКАЙ ВЯСНЫ»

Вясной 2011 года прагрэсіўная грамадскасць многіх краін свету пляскала ў далоні так званай «арабскай вясне». Але ўжо праз некалькі месяцаў аказалася, што былыя прыгнечаныя нічым не лепшыя за былых прыгнятальнікаў

У сухім астатку

Па-першае, аказалася, што ўсе змагары за свабоду ў арабскім свеце — запар найміты, члены «Аль-Каіды» і ісламісты. Таму сёння народы Туніса, Егіпта і Сірыі змагаюцца менавіта супраць радыкальных ісламістаў, якія прыйшлі да ўлады. А ў Лівіі проста ідзе ўзаемная «рубка» зляцеўшых са шпулек шматлікіх плямёнаў.

Па-другое, аказалася, што змагары за свабоду ніколі не былі і ўжо тым больш цяпер не знаходзяцца ў большасці ў сваіх краінах. Тое, што ў Лівіі і Сірыі першапачаткова дзейнічалі, у асноўным, замежныя найміты, якія падтрымліваюцца манархіямі Персідскага заліва, для многіх было відавочна першапачаткова. Сёння ж відавочна, што і ў Егіпце, і ў Тунісе тыя ж сілы проста змаглі асядлаць масавую незадаволенасць карупцыяй і шматгадовай недзеяздольнасцю кіраўніцтва гэтых дзвюх краін.

Па-трэцяе (і гэта, мабыць, галоўнае), войны ў Лівіі і Сірыі, палітычныя ўзрушэнні ў Егіпце і Тунісе і ўзмоцненая гульня ў дэмакратыю пад воплескі «міжнароднай супольнасці» прывялі не да вырашэння праблем развіцця гэтых краін, а да іх катастрафічнага пагаршэння. Нават цяжка сказаць, што горш: тое, што з-за канфліктаў аказаліся разбуранымі многія інфраструктуры, як у Лівіі ці Сірыі, або тое, што з-за гульняў у дэмакратыю быў страчаны каштоўны час для вырашэння самых надзённых, неадкладных эканамічных праблем (як у Тунісе або Егіпце). Бо свет паступова, але непазбежна ўцягваецца ў другую фазу глабальнага крызісу, якая будзе значна больш разбуральнай, чым першая. Адпаведна, ствараць і рэалізоўваць праграму эканамічнага развіцця ў гэтых умовах будзе ўжо значна складаней, чым у перыяд з 2011-га па 2013 год.

Егіпецкі прыклад

Возьмем Егіпет. Дэфіцыт бюджэту гэтай краіны расце з моманту змены ўлады ў 2011 годзе. У сакавіку 2013-га Міністэрства фінансаў заявіла, што дэфіцыт бюджэту дасягнуў 10,6% ВУП за першыя дзесяць месяцаў фінансавага года 2012-2013: 26,5 мільярда долараў, у параўнанні з 16,8 мільярда за перыяд з ліпеня 2011 г. па красавік 2012 г. У 2012 годзе паступленні ў бюджэт склалі 50 мільярдаў, а выдаткі — 77 мільярдаў долараў.

Праблема, аднак, у тым, што пытанні эканамічнага развіцця краіны за гэты час не толькі не вырашаліся, але і не ставіліся. У тым ліку і цяперашні пераварот, ажыццёўлены стомленымі ад «Братоў-мусульман» егіпцянамі з ваеннымі на чале, быў выключна палітычным, паліттэхналагічным дзеяннем, разборкай на прадмет таго, каму павінна належаць улада. Патрэбы ж краіны на гэтым фоне нікога не цікавілі і не цікавяць: і ваенныя, і ісламісты хочуць крэдытаў МВФ і папулісцкіх хуткіх рашэнняў.

Што будзе адбывацца далей?

Ваенныя, якія зараз перамаглі, зноў пачнуць набіваць кішэні і ездзіць па міжнародных форумах, шукаючы падтрымкі. Але галодныя егіпцяне зноў не атрымаюць ніякіх перспектыў і праз некалькі дзясяткаў месяцаў падтрымаюць падчас чарговага путчу чарговых радыкалаў. І так можа працягвацца да бясконцасці.

І гэта — пры тым, што Егіпет багаты на рэсурсы (нафта — не выключэнне). Мае шматлікае насельніцтва з праслойкай нядрэнна адукаваных спецыялістаў і валодае ўсімі магчымасцямі для таго, каб выбудоўваць і развіваць магутны ўнутраны рынак. Існуюць сур'ёзныя напрацоўкі аж да тэхнічных праектаў таго, якім чынам можна вырашыць водную, харчовую праблему — спадчына перыяду актыўнага супрацоўніцтва Егіпта з СССР. Накід праграмы эканамічнага развіцця, якая дазваляе выкарыстоўваць гэты зачын, быў нядаўна апублікаваны Хусейнам Аскары, старшынёй Еўрапейскай працоўнай партыі ў Швецыі ў амерыканскім часопісе Executive Intelligence Review.

Аднак усё гэта не вельмі цікава цяперашнім егіпецкім кіраўнікам і яшчэ менш цікава прадстаўнікам міжнароднай супольнасці.

Што ж такое дэмакратыя?

Гледзячы на гэты сумны прамежкавы вынік «арабскай вясны», міжволі зноў задумваешся: а што ж такое дэмакратыя? Выкананне працэдур? Адпаведнасць міжнародным стандартам? Сяброўства з ЗША і Вялікабрытаніяй?

Мабыць, дэмакратыя — гэта такі стан грамадства, у якім народ можа прымусіць сваю эліту вырашаць агульназначныя праблемы сацыяльна-эканамічнага развіцця. А такая дэмакратыя сёння становіцца неактуальнай і нецікавай. Як пісаў нядаўна на старонках «Звязды» Сяргей Кізіма, дэмакратыя ў свеце заканчваецца.

Беларусь з яе ўнікальным вопытам народаўладдзя і працы кіраўніцтва дзяржавы ў інтарэсах большасці насельніцтва з'яўляецца выдатным прыкладам сапраўднай дэмакратыі. І нездарма менавіта ў нашай краіне была зроблена першая, няўдалая спроба гвалтоўнай змены ўлады — 19 снежня 2010 года, якая стала прадмовай да «арабскай вясны».

Аднак сёння мы стаім перад цэлым шэрагам выклікаў (эканамічных, палітычных, геапалітычных), якія пагражаюць гэтым заваёвам. Як ва ўмовах глабальнага крызісу, у цэнтры аднаго з самых нестабільных рэгіёнаў свету захаваць і прымножыць здабытак беларускага народаўладдзя? Важнасць адказу на гэтае пытанне сёння цяжка пераацаніць.

Юрый ЦАРЫК, палітычны аналітык.

З ПАЕЗДКАЙ У ЕГІПЕТ ЛЕПШ ПАЧАКАЦЬ

Міністэрства замежных спраў рэкамендуе беларускім грамадзянам, якія знаходзяцца на адпачынку ў Егіпце, устрымацца ад паездак за межы курортных зон. Таксама ў сувязі з абвастрэннем ўнутрыпалітычнай сітуацыі ў гэтай краіне нашым суайчыннікам рэкамендавана выключыць наведванне Каіра і іншых буйных гарадоў, пазбягаць месцаў масавага знаходжання людзей, за межамі атэляў праяўляць павышаную абачлівасць. Турыстам, якія знаходзяцца ў раёнах дзеяння камендацкай гадзіны — у прыватнасці, на курортах Паўднёвага Сіная (гарады Шарм эль Шэйх, Дахаб, Нувейба і Таба), не трэба пакідаць тэрыторыі атэляў з 19 да 6 гадзін. «У гэтых умовах грамадзянам Беларусі, якія плануюць свой адпачынак у рэгіёне, рэкамендавана ўстрымацца ад наведвання Егіпта да нармалізацыі сітуацыі ў краіне».

Сяргей РАСОЛЬКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению частного предприятия «Торговый дом «Гомельстекло-Витебск» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже

здания склада ватина,

об. пл. 578,9 кв.м, инвентарный номер 200/С-53799, расположенного по адресу: **г. Витебск, ул. Академика Павлова, 42 А.**

Начальная цена с НДС – 900 402 000 бел. руб.

Площадь земельного участка – **0,2387 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования; ограничение: 0,0069 га – охранная зона линий электропередачи до 1000 В; 0,0219 га – санитарно-защитная полоса водовода; 0,0207 га – охранная зона канализационного коллектора; 0,0225 га – охранная зона тепловых сетей; 0,2374 га – водоохранная зона водных объектов вне прибрежных полос (р. Западная Двина)).

Обременения – частичная аренда.

Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в отделении № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Аукцион состоится **01.10.2013** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.09.2013** до 17.00 по указанному адресу

Тел.: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71.

ОАО «Гомельхлебопродукт»
ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Гомельхлебопродукт» 30 августа 2013 года.
ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О распределении прибыли Общества и выплате дивидендов за 2012 год.

Собрание состоится по адресу: г. Гомель, ул. Мазурова, 48, актовый зал ОАО «Гомельхлебопродукт». Начало в 14.00.

С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться по адресу: г. Гомель, ул. Мазурова, 48, тел. (8 0232) 72 59 40.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет ОАО «Гомельхлебопродукт».

УНП 400010980

Утерянный представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланк полиса по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь серии ВР № 1634132 **считать недействительным.**

УНП 101883943